# ІДЭНТЫФІКАЦЫЯ ПОСТМАДЭРНІЗМУ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**М.М. Страха**

Для сучаснага літаратурнага працэсу характэрна імкненне да стварэння новых форм, набыцця новых якасцей і зместу. Маладыя, часам

вельмі амбіцыйныя аўтары робяць спробу адысці ад мастацкіх традыцый папярэдніх пісьменніцкіх пакаленняў і ўвесці беларускае прыгожае пісьменства ў новую эру постмадэрнісцкай культуры. Наколькі ж глыбока постмадэрнісцкія тэндэнцыі знаходзяць свае выяўленне ў мастацкіх творах сучасных беларускіх аўтараў? Што выступае ў якасці матыва памкненняў маладых пісьменнікаў стварыць літаратуру новага характару?

У літаратурна-філасофскім эсэ "Адвечным шляхам" І.Канчэўскі, асэнсоўваючы сацыяльны, гістарычны і этычны аспекты беларускай ідэі, гаворыць пра асаблівасці светапогляду беларускага народу, дэтэрмінаваныя, паводле думкі пісьменніка, перш-наперш, рэгіёнам пражывання этнасу, размешчаным на мяжы Усходу і Захаду. Падобнае прамежкавае становішча паўплывала не толькі на гістарычны і сацыяльны план развіцця нацыі, але і абумовіла магчымасць пранікнення еўрапейскіх культурных тэндэнцый на беларускую глебу. Узгаданая акалічнасць з'яўляецца іманентна-вызначальнай рысай менталітэту беларускага народу. Постмадэрнізм, як спроба выявіць на ўзроўні мастацкага тэксту пэўны светаўспрымальны комплекс, што складаецца са спецыфічных эмацыянальна афарбаваных уяўленняў, такім чынам, у беларускай літаратуры ёсць не што іншае, як чарговае праяўленне еўрапейскай ідэі. Існуе думка, што постмадэрнізм, як патаптанне усякіх традыцый, аказаўся ўсяго толькі эпігонска перанятай заходнееўрапейскай традыцыяй.

Наяўнасць пэўнай ідэі прадугледжвае існаванне нейкай канкрэтнай асновы, базы – таго, што магло б служыць своеасаблівай кропкай адштурхоўвання пры рэалізацыі дадзенай ідэі. Для сучасных аўтараў-"постмадэрністаў" у якасці падобнай глебы выступае так званы "сацыялістычны рэалізм". Менавіта на адмаўленні гэтай літаратурнай з'явы, а таксама пераадоленні "зацыкленасці" папярэдніх пісьменніцкіх пакаленняў на праблемах нацыянальнага абуджэння спрабуюць стварыць постмадэрнісцкі літаратурны свет Ю.Гумянюк, А.Аркуш, І.Сідарук, Л.Сільнова і іншыя аўтары – прадстаўнікі так званай "новай генерацыі пісьменнікаў". Так, напрыклад, Ю.Гумянюк сваю кнігу "Твар Тутанхамона" назваў "апошнім мэталёвым цвіком", якім ён "прыбіў сацрэалізм да крыжа беларускай паэзіі".

Акрэсліўшы асноўныя характэрныя рысы памкненняў маладых творцаў да ўвасаблення постмадэрновага мастацтва ў рэаліі культурнага жыцця Беларусі, паспрабуем асэнсаваць ступень аб'ектыўнасці адлюстравання постмадэрнісцкіх тэндэнцый непасрэдна ў сённяшнім беларускім прыгожым пісьменстве. Дзеля гэтага звернемся да некаторых сутнасных характарыстык адзначанага літаратурнага напрамку.

Пачнем з таго, што дамінантнымі ў паняційным апараце постмадэрністаў з'яўляецца зварот да ўжо знанага і толькі да яго (менавіта з матэрыі вядомай, з культурнай спадчыны будуюць свае творы постмадэрністы), адсутнасць асобаснага пачатку, а таксама катэгорыя тэксту і знака. (Нагадаем, што для постмадэрністаў свядомасць чалавека і ўвесь свет ёсць тэкст. Толькі ён, адзіны і ўселадны, з'яўляецца крыніцай праблем, сюжэтаў, персанажаў, прасторавага і часавага атачэння для іх. Пры гэтым,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

паводле постмадэрністаў, няма неабходнасці суадносіць пэўны тэкст рэчаіснасцю, куды больш важна пацвердзіць яго аўтарыт: інтэртэкстуальна, інакш кажучы – праз іншыя аўтарытэтныя тэксть наяўнасць якіх у новым тэксце рэалізуецца праз суцэльныя рэмінісцэнцы алюзіі, спасылкі, адным словам – праз гіперцытацыю).

Якое ж месца знаходзіць увасабленне постмадэрнісцкіх мастацкі прынцыпаў у сучаснай беларускай літаратуры? Сярод аўтараў, які найчасцей згадваюцца ў звязцы з азначаным напрамкам, – А.Разанаў Ю.Гумянюк. Аднак аналіз твораў пісьменнікаў дае падставу гаварыць пр адсутнасць у іх асноўных, вышэй указаных, постмадэрнісцкіх паняццяў Пры гэтым можна ўзгадаць найбольш паказальныя ў дадзеным выпадк словы А.Разанава: "Творчасць – сустрэча з невядомым...." "Паэзія траціцца калі творыцца па аналогіі, па традыцыі, па майстэрстве – з матэрыі вядомай" [1].

Сказанае дае магчымасць вылучыць на дадзены момант наяўнасці пэўных асобных элементаў постмадэрнізму ў творчасці сучасных аўтараў Гэта значыць, што сённяшняе беларускае прыгожае пісьменства знаходзіцца толькі на пачатку свайго "высокага шляху" да ўвасаблення ў сваей мастацкай прасторы тэндэнцый акрэсленага літаратурнага напрамку.

Літаратура:

1. Разанаў А. Паляванне ў райскай даліне. – Мн., 1995. – С.179, 198.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ